Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

20 ЛЮТАГА 2018 г. АЎТОРАК № 35 (28651)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Дар’я Домрачава думае аб завяршэнні кар’еры?

СТАР. 3



Барометр сталічнага рынку працы

СТАР. 4



Шчаслівыя разам — ужо 62 гады!

ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый СЕЛІВЕРСТАЎ, намеснік міністра фінансаў:**

*«Той прафіцыт у 2,8 млрд BYN, або 2,7 % да ВУП, які быў летась, у нас захаваны, і зроблены нейкі зачын на бягучы год — мы маем рэзерв, каб у першую чаргу пагашаць дзярждоўг. Калі і ў 2018 годзе будзе прафіцыт бюджэту, гэта дасць магчымасць нам больш камфортна абслугоўваць дзяржаўны доўг. Але трэба яшчэ сказаць, што бюджэт на 2018 год мы лічылі, зыходзячы з кансерватыўнага сцэнарыя, як і на 2017-ы, што сябе апраўдала. Таму на рост эканомікі мы заклалі яшчэ дадатковы рэзервовы фонд. Калі эканоміка будзе расці па аптымістычным сцэнарыі, то ў нас прадугледжаны сродкі ў рэзервовым фондзе, якія будуць накіраваныя на выдаткі і ў першую чаргу на павышэнне заробкаў работнікам бюджэтнай сферы».*

НАДВОР’Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | 0° |
| Віцебск | - 4° |
| Гомель | - 3° |
| Гродна | 0° |
| Магілёў | - 3° |
| Мінск | - 4° |

ISSN 1990 - 763X

# Выбары адбыліся



Фота БЕЛТА.

**Яўка ў больш чым 77 % — досыць высокі паказчык для выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў. Менавіта такую лічбу зафіксавалі ў Цэнтральнай выбарчай камісіі. Па словах Лідзіі Ярмошынай, яе старшыні, гэта тлумачыцца актыўнай работай як мясцовых улад, так і СМІ, а яшчэ — неабыякавасцю да палітычнай кампаніі саміх кандыдатаў у дэпутаты. Усяго было абрана 18 110 дэпутатаў. Свой голас 18 лютага аддаў і Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, які галасаваў на ўчастку № 1 Вяснянскай выбарчай акругі № 39 Цэнтральнага раёна Мінска, размешчаным у Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры.**

Якога кандыдата лепей абраць у дзень выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў? Парада ад кіраўніка дзяржавы: лепш таго, каго вы бачыце ў дзеянні. Па словах Прэзідэнта, ён прагаласаваў за «дзейнага чалавека, які працуе і прыносіць карысць нашай дзяржаве». «Гэта галоўны матыў для мяне як Прэзідэнта, і іншага матыву, напэўна, быць не можа», — заявіў беларускі лідар на выбарчым участку.

СТАР. 2

**Дзень мясцовых выбараў 2018 года запомніцца тым маладым людзям, якія прыйшлі на выбарчы ўчастак у Сеніцкі цэнтр культуры (Мінскі раён). Пасля таго як моладзь апусціла ў скрыні бюлетэні, хлопцаў і дзяўчат запрасілі здзейсніць агляднага палёт на верталёце Мі-2 са сцягам-расцяжкай «Галасуй!».**






Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Галасаванне дома. На маршруце Сяргея БОНДАРАВА і Давіда КАЗАРАНА — сямнаццаць выбаршчыкаў. Першымі яны завіталі да 96-гадовай Ніны Канстанцінаўны ЦЕРАБАВАЙ.**

■ Спрэчны момант

# НЕ ПРАЕХАЦЬ І ЯБЛЫКУ НЕ ЎПАСЦІ

## Ужо каторы год жыхары змагаюцца супраць агульнай паркоўкі ў двары



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Дом нумар 28 на сталічным праспекце Незалежнасці мае некалькі безумоўных выгод. Побач Палац Рэспублікі, парк Горкага, Дом афіцэраў. За некалькі крокаў — толькі вуліцу перайсці — Белдзяржцырк. Вось толькі падчас прадстаўленняў і масавых мерапрыемстваў жыхары аказваюцца літаральна забарыкадзіраванымі ва ўласным двары машынамі «чужакоў»...**

### Нават пажарная не пад'едзе

Гаспадары двара расказваюць, што раней тры заезды ў двор перакрывалі дэкаратыўныя металічныя вароты, унутр аўтамабілі маглі трапіць толькі праз вялікую арку з боку вуліцы Янкі Купалы. Але гадоў 15 таму вароты адчынілі.

Большасць прыпаркаваных пад вокнамі аўтамабіляў належыць не гаспадарам, што маюць тут кватэры, а прыезджым з другіх раёнаў Мінска, а то і рэгіёнаў і нават краін. Зразумела, тут нават гаворкі пра свабоднае перамяшчэнне па сваім аўто быць не можа. Калі пашанцуе, можна патэлефанаваць па нумары, які пакінуў пад шклом уладальнік машыны. Калі не — давядзецца выклікаць таксі альбо ісці да бліжняга прыпынку грамадскага транспарту.

СТАР. 4

# Выбары адбыліся

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Пасля таго як Аляксандр Лукашэнка апусціў бюлетэнь у спецыяльную урну, ён адказаў на пытанні журналістаў. Адно з іх датычылася падзеі на Алімпіядзе ў Пхёнчхане, якая яшчэ днямі ўзрушыла нашу грамадскасць, — судзейства ў адносінах да беларускага фрыстайліста Антона Кушніра. Прэзідэнт лічыць, што такім чынам «выкінулі галоўнага канкурэнта з фіналу». Так, сярод суддзяў былі прадстаўнікі Расіі, Кітая, Швейцарыі. «Усе яны працягнулі ў фінал сваіх спартсменаў. Яны Антона Кушніра паспрабавалі выкінуць у першай спробе кваліфікацыі, а ў другой ім проста нічога не заставалася, як зрабіць яго сёмым, таму што шэсць праходзілі. Калі б разумныя былі, то хоць бы ў фінал пусцілі. Але яны разумелі: пусці яго ў фінал — усім будзе «труба». І зноў беларусы два «золаты», як і на мінулай Алімпіядзе, могуць заваяваць», — растлумачыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка, які з'яўляецца Прэзідэнтам Нацыянальнага алімпійскага камітэта, ужо накіраваў у адрас Прэзідэнта Міжнароднага алімпійскага камітэта Томаса Баха прэтэнзіі наконт такога судзейства. Хоць айчынная федэрацыя спрабавала падаць пратэст, перагаварыць з міжнароднай федэрацыяй у Пхёнчхане, але адказ «зразумела які быў». «Мне давялося ўначы падняць па трывозе МЗС, задзейнічаць пасольства ў Рэспубліцы Карэя, накіраваць неадкладна ўрадавую тэлеграму ў адрас Баха. Выказаў яму ўсё, як я думаю, у мяккай форме», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прадстаўнік расійскага тэлебачання пацікавіўся ў Прэзідэнта нашай краіны тым, як кіраўнік дзяржавы ставіцца да прапановы перанесці перагаворную пляцоўку па ўрэгуляванні канфлікту ва Украіне з Беларусі ў Казахстан. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што мы ўжо значную ролю ў гэтым адыгралі і, хутчэй, выконваем дадзенае калісьці слова забяспечваць неабходную пляцоўку. Інтарэс наш тут толькі ў адным: каб спынілася кровапраліцце, жах, падчас якога брат ідзе на брата і забівае яго. Тым больш Беларусь вельмі адчувае ўзрушэнні ў суседняй краіне: толькі афіцыйна да нас за час канфлікту прыбылі больш за 160 тысяч украінскіх бежанцаў, для якіх, як і для беларусаў, працуюць бясплатныя адукацыя і медыцына. Усё гэта дадатковыя выдаткі. Да таго ж разам з патокам людзей у краіну «хлынула» зброя, што запатрабавала зараз значнага ўмацавання мяжы.

Па словах Прэзідэнта, у першы год канфлікту наша краіна накіравала прапановы, як яго можна ўрэгуляваць. Аднак чыноўнікі з Бруселя ў той час іх не прынялі. «І я цяпер лічу, што многія еўрапейцы зацікаўлены ў гэтым канфлікце, як бы яны сябе ні прадстаўлялі міратворцамі. Калі б прынялі — быў бы варыянт», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён падкрэсліў, што беларускія міратворцы гатовы стаць паміж бакамі канфлікту пры ўмове адпаведнай дамоўленасці паміж прэзідэнтамі Украіны і Расіі — Пятром Парашэнкам і Уладзімірам Пуціным.

***

Лідзія Ярмошына падвяла папярэднія вынікі выбараў. Па ўдакладненых даных, яўка выбаршчыкаў склала 77,23 %. Удзел у галасаванні прынялі 5,3 мільёна чалавек. Датэрмінова прагаласавалі 2,4 мільёна выбаршчыкаў. У асноўны дзень выбараў на ўчасткі прыйшло амаль 2,5 мільёна чалавек. Па месцы жыхарства прагаласавалі 429 тысяч чалавек.

У ЦВК ужо паступіла 12 зваротаў па электроннай пошце ад кандыдатаў у дэпутаты, назіральнікаў, выбаршчыкаў. Па словах старшыні ЦВК, чакаецца, што колькасць скаргаў не будзе крытычнай. Кандыдатам у дэпутаты яна параіла звяртацца дакладна па адрасе, не парушаючы парадку падачы заяў і скаргаў. Так, калі гаворка ідзе пра раённыя, гарадскія, пасялковыя, сельскія Саветы, то звяртацца трэба ў тэрытарыяльныя камісіі, калі пра абласныя — то ў акруговыя, пра Мінгарсавет — у раённыя камісіі сталіцы, якія дзеяць.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

■ Выстаўка BUDEXPO

# Плюс кірмаш інавацыйных праектаў

**Больш як 30 інавацыйных праектаў будзе прадстаўлена на спецыялізаванай будаўнічай выстаўцы BUDEXPO, якая пройдзе 21—24 сакавіка ў гандлёва-лагістычным комплексе «Глобус Парк» у аграгарадку Шчомысліца Мінскага раёна, паведаміў намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Дзмітрый СЕМЯНКЕВІЧ.**

Падчас выстаўкі адбудзецца кірмаш інавацыйных праектаў. «Različваем, што некалькі дзясяткаў праектаў будуць прадстаўлены, а найбольш перспектыўныя з іх, гатовыя да ўкаранення, — адзначаны ўзнагародамі. Ужо заяўлена каля 20 праектаў, сярод якіх хуткаўзведзеныя энергаэфектыўныя дамы эканом-класа, тэхналогія будаўніцтва экалагічна чыстых і энергаэфектыўных дамоў сядзібнага тыпу на аснове лёну. Заяўлены таксама праект «Будаўнічы 3D-прынтар», — расказаў **кіраўнік праектаў цэнтра падтрымкі прадпрымальніцтва «Дзелавыя медыя» Аляксандр ПАТУЦІН.** Галоўны стэнд выстаўкі таксама будзе адлюстроўваць інавацыйную тэматыку, яго зойме акцыянернае таварыства «Гомельшкло» са сваім энергаэфектыўным шклом. Упершыню падчас будаўнічых выставак у Беларусі пройдуць конкурсы прафесійнага майстэрства Budмайстар-2018 на намінацыях «Найлепшы муляр» і «Найлепшы тынкоўшчык».

**Сяргей КУРКАЧ**

■

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ФІНЛЯНДЫЯ І ШВЕЦЫЯ ГАТОВЫЯ АДПРАВІЦЬ МІРАТВОРЦАЎ У ДАНБАС

**Фінляндыя гатова адправіць міратворцаў у Данбас. Пра гэта на Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы заявіў прэзідэнт гэтай краіны Саулі Нііністё.**



Раней пра гатоўнасць накіраваць сваіх міратворцаў у зону канфлікту заявіла Швецыя. Па словах міністра абароны Петэра Хульквіста, шведскія міратворцы адпраўяцца ва Украіну пры наяўнасці ўмоў і калі Швецыя будзе ўпэўненая ў тым, што міратворчая місія можа дапамагчы, паведамляе RT.

Днямі Прэзідэнт Беларусі таксама заявіў аб магчымай адпраўцы беларускіх міратворцаў ва Украіну. Таксама пра гатоўнасць адправіць міратворцаў у зону ўкраінскага канфлікту заявіла ФРГ.

На думку экс-камандуючага ўзброенымі сіламі ЗША ў Еўропе генерал-лейтэнанта арміі ЗША Бэна Ходжэса, у міратворчай місіі павінны ўдзельнічаць «прафесійныя, здольныя, моцныя» краіны, «якія нельга адсунуць убок». У якасці прыкладу такіх краін Бэн Ходжэс назваў Фінляндыю і Швецыю, якія не ўваходзяць у НАТО. Бэн Ходжэс падкрэсліў, што ЗША хочуць урэгуляваць канфлікт у Данбасе, «але не так, каб захаваць за Расіяй яе дасягненні».

### КІРАЎНІК МЗС ПОЛЬШЧЫ ЗАЯВІЎ ПРА НЕАБХОДНАСЦЬ ПАПРАВАК У ЗАКОН ПРА ХАЛАКОСТ

**МЗС Польшчы прызнала неабходнасць удакладнення спрэчных момантаў у законе аб пакаранні за публічнае абвінавачванне польскай нацыі ў датычнасці да халакосту, які прывёў да канфлікту ў адносінах краіны з Ізраілем, Украінай і ЗША.**

Пра гэта паведаміў у інтэрв'ю тэлеканалу Polsat кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Яцэк Чапутовіч. «У гэтым выпадку пэўная інтэрпрэтацыя неабходная, каб ліквідаваць сумненні, якія з'яўляюцца», — зазначыў ён, адказваючы на пытанне пра магчымасць абнаўлення спрэчнага закона. «Пачакаем рашэння Канстытуцыйнага суда», — дадаў міністр. Каментуючы інцыдэнт з нанясеннем свастыкі на будынак пасольства Польшчы ў Тэль-Авіве, які адбыўся ў нядзелю, Чапутовіч нагадаў, што «Ізраіль нясе адказнасць за бяспеку дыпламатычнага прадстаўніцтва». «Мы будзем гэтага дамагацца», — сказаў ён, адзначыўшы існаванне ў Ізраілі антыпольскіх настрояў. «Гэта нядобра, — лічыць ён. — Трэба вярнуцца да збліжэння і супрацоўніцтва».

У нядзелю невядомыя нанеслі свастыку і абразлівыя для палякаў надпісы на дзверы польскай амбасады ў Тэль-Авіве. Польшча звярнулася да ўлад Ізраіля, каб яны расследавалі інцыдэнт і распачалі крокі з мэтай забеспячэння аховы дыппрадстаўніцтва. На думку МЗС, варта рашуча знізіць тэмпературу дыскусіі, якая вядзецца ў абедзвюх дзяржавах, таму што сённяшні ўзровень не спрыяе дыялогу.

### У 2017 ГОДЗЕ З БАНКАМАТАЎ У РАСІІ СКРАЛІ БОЛЬШ ЗА 5 МЛРД РУБЛЁЎ

Летась махляры скралі з банкаматаў на тэрыторыі Расіі грошай удвая больш, чым годам раней. Сума выкрадзенага склала больш за 5 млрд рублёў, піша газета «Известия» са спасылкай на матэрыялы кампаніі «Інфармабарона».

Амаль 90 % ад колькасці ўсіх нападаў і крадзяжоў прыпадае на выпадкі фізічнага ўзлому прыстасавання або нават яго крадзяжу цалкам. Прыкладна 10 % — гэта скімінг (выкарыстанне прылады, якая счытвае даныя з картаў). Менш за 1 % складаюць лагічныя атакі, калі зламыснікі пранікаюць ва ўнутраную сетку банка для кіравання сеткамі прылад самаабслугоўвання. У гэтым выпадку ўзломшчык атрымлівае доступ да сервера кіравання банкаматамі, запускае шкоднаснае праграмнае забеспячэнне і затым з дапамогай падробленых картаў здымае грошы. Доказаць факт крадзяжу даволі складана, паколькі банкаматныя транзакцыі практычна не аспрэчваюцца.

У некаторых выпадках прылады заражалі вірусамі-шпіёнамі, размяшчалі хакерскае абсталяванне побач з банкаматам (бесправодны скімінг). Гэта новыя схемы ўзлому банкаматаў.

■ Падзея

# ПАЛЁТ НАД МАЛОЙ РАДЗІМАЙ

## І яшчэ шмат цікавага падрыхтавалі на Міншчыне для выбаршчыкаў

**Жыхары Мінскай вобласці зрабілі свой выбар: нехта падчас датэрміновага галасавання, а нехта непасрэдна ў дзень выбараў. Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў Дзяржынскім і Мінскім раёнах і пацікавіліся, з якім настроем людзі ішлі галасаваць.**

На Петкавіцкі выбарчы ўчастак № 20, што ў Дзяржынскім раёне, першы прыйшоў Валерый Пачкоўскі. Валерый Вячаслававіч працуе млынаром у адкрытым акцыянерным таварыстве «Крутагор'е-Петкавічы».

— Па дарозе на работу вырашыў прагаласаваць, каб потым не зрывацца дачасна, — кажа ён. — У мяне двое дзяцей, старэйшы сын, якому споўнілася васямнаццаць гадоў, галасаваў упершыню, датэрмінова.

Валерый Пачкоўскі ніколі не прапускае выбараў дэпутатаў розных узроўняў, а таму і пажадаў землякам, каб яны актыўна праяўлялі сваю грамадзянскую пазіцыю.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— У нас датэрмінова прагаласавалі 424 чалавекі, гэта амаль 40 працэнтаў ад агульнай колькасці выбаршчыкаў, — канстатавала старшыня камісіі Валянціна Рабіноўская. — Участак вялікі — 1073 выбаршчыкі, якія пражываюць у дастаткова аддаленых 10 населеных пунктах. Калі ўручалі запрашэнне, многія, асабліва пажылыя людзі, выказалі пажаданне прагаласаваць дома.

Як, напрыклад, жыхарка Фаніпаля Ніна Церабава. Ніне Канстанцінаўне 96 гадоў. І, вядома, члены камісіі адгукнуліся на яе просьбу.

— Раней я сама з задавальненнем хадзіла на выбары. Гэта заўсёды было для мяне свята — сустрэчы з людзьмі, знаёмымі, якіх даўно не бачыла. А цяпер не стае сіл, каб самой дабрацца да ўчастка. Дзякуй, што пайшлі мне насустрач, — расчулілася жанчына.

На маё пытанне, што б яна хацела ад свайго абранніка, Ніна Канстанцінаўна адказала: «Ён лепш за мяне ведае, што зрабіць для Фаніпаля і дабрабыту яго жыхароў. А мне ўсяго хапае, акрамя здароўя, пенсія добрая.

Жанчына жыве з былой нявесткай у адной кватэры. «Жывём нармальна, дружна», — адзначыла Вольга Церабава. — Я не перастаю здзіўляцца энергіі сваёй свякрыві, яе адказнасці ў стаўленні да грамадскай справы.

У Сеніцкім Цэнтры культуры месціліся адразу два выбарчыя ўчасткі, на якіх было даволі ажыўлена. Многія выбаршчыкі прыходзілі з дзецьмі. Іван і Вікторыя Чыжыкавы прывялі з сабой чацвёра дзяцей — усе хлопчыкі, самы маленькі — на руках у бацькі.

— Чаму ўзялі з сабой гадаванцаў? — пацікавілася ў бацькоў.

— А як жа іначай? — здзіўляецца маці. — У нас вялікая дружная сям'я, і ўсюды мы разам. Па-другое, мы падаём сваім сынам прыклад. Яны ў свой час таксама будуць галасаваць. Няхай разумеюць, што гэта адзін са спосабаў выказаць сваю думку, грамадзянскую пазіцыю. Мы, як шматдзетная сям'я, спадзяёмся, што кандыдат у дэпутаты, за якога аддалі голас, будзе прадстаўляць інтарэсы такіх жа сем'яў, якія выхоўваюць трох-чатырох і больш малых.

Наталля Цвердахлеб прыйшла на выбары разам з сынам Андрэем, які ўпершыню галасуе. У жанчыны чацвёра дзяцей — таксама ў будучым выбаршчыкі. «Андрэй, нягледзячы на свой юны ўзрост, вельмі адказны», — кажа Наталля Аляксандраўна.

— Вельмі хвалююся. Гэтае адчуванне можна параўнаць з экзаменам у школе, — прызнаўся юнак. — Я вывучаў праграмы кандыдатаў у дэпутаты, глядзеў іх відэаролікі. І зрабіў выбар, за каго аддаць голас. Я падтрымаў таго, хто не забыў пра развіццё айчыннага спорту.

Хлопец больш як восем гадоў гуляе ў футбол, сочыць за выступленнямі нашых спартсменаў на Алімпіядзе. «Хачу, каб наш беларускі футбол узняўся на сусветны ўзровень. Я звычайны беларускі хлопец і для мяне гонар унесці лепту ў будучыню краіны, у працвітанне айчыннага спорту».

Андрэю Цвердахлебу і дзевяці яго сябрам, якія галасавалі ўпершыню, зрабілі нечаканы сюрпрыз, які, дарэчы, здзівіў не толькі віноўнікаў урачыстасці, але і ўсіх жыхароў населенага пункта. На стадыёне аграгарадка прызямліўся верталёт з расцяжкай «Галасуй», які ў два заходы «пракаціў» юных выбаршчыкаў над Мінскім раёнам.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■



■ Надвор'е

# МАРАЗЫ...

## У чацвер і пятніцу сіноптыкі абяцаюць месцамі да мінус 20 градусаў

**Апошні месяц зімы не спяшаецца здаваць свае пазіцыі: на гэтым тыдні чакаецца халоднае надвор'е. Ды і снегу будзе больш, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўмовы надвор'я будзе вызначаць воблась павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў вільготнай паветранай масе. Таму ў асобных раёнах краіны не абыдзецца без невялікага снегу. Месцамі на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўдзень будзе ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла. Пахаладанне прыйдзе ў сераду. Тады пад уплывам франтальнага падзелу на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. За фронтам на тэрыторыю краіны накіруецца халоднае паветра з арктычных мораў. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 7 да мінус 13 градусаў, па паўночным усходзе краіны будзе да 15 марозу. Месцамі ўначы па краіне пры праясненнях да мінус 16—19 градусаў. Удзень чакаецца ад мінус 3 да мінус 8 градусаў, толькі па крайнім паўднёвым захадзе краіны температурны фон будзе крыху вышэйшы: уначы 4—6 марозу, удзень — ад нуля да мінус 2 градусаў.

Самыя моцныя маразы тыдня прагназуюцца ў ноч на чацвер і на пятніцу. Так у чацвер у асобных раёнах Беларусі магчымы невялікі кароткачасовы снег, месцамі на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 8 да мінус 14 градусаў, па паўночным усходзе краіны будзе 15—18 марозу, месцамі па краіне пры праясненнях да мінус 19—20 градусаў. Удзень чакаецца ад мінус 4 да мінус 9 градусаў. Толькі па крайнім паўднёвым захадзе краіны ўначы прагназуецца 4—7 марозу, а ўдзень — ад мінус 1 да мінус 3 градусаў. І ў пятніцу захаваецца марознае надвор'е, у асобных раёнах краіны пройдзе кароткачасовы снег. На дарогах месцамі чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 11—17 марозу, пры праясненнях ад мінус 18 да мінус 20 градусаў. Удзень будзе ад мінус 6 да мінус 12 градусаў. У паўднёва-заходніх раёнах краіны маразы прагназуюцца больш слабыя. Там уначы будзе мінус 5—10 градусаў, удзень — 4—5 марозу.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Алімпіяда-2018

# Ці сказала яна сваё апошняе слова?

## Дар'я Домрачава пасля алімпійскага «серабра» ў Пхёнчхане не ўпэўненая, ці працягне кар'еру яшчэ на чатыры гады

**У праграме біятлоннага алімпійскага турніру засталіся толькі эстафеты. Сёння пройдзе змешаная гонка, дзе каманда будзе складацца з двух мужчын і дзвюх жанчын. Нашу краіну тут прадстаўляць Надзея Скардзіна, Дар'я Домрачава, Сяргей Бачарнікаў і Уладзімір Чапелін.**

А на выхадных аматараў спорту працягнула радаваць Дар'я Домрачава, трэцюю Алімпіяду запар яна дорыць моманты захаплення балельшчыкам па ўсім свеце, паказваючы неверагодную волю да перамогі. Напэўна, на мас-старт і сама Дар'я настройвалася па-асабліваму, бо гэта была апошняя магчымасць узяць узнагароду ў асабістай гонцы на цяперашняй Алімпіядзе, да таго ж рэабілітавацца за няўдачы ў мінулых стартах. І яна гэта зрабіла ў сваім стылі — прыгожа.



Фота БЕЛТА.

З алімпійскім «серабром» спартсменку **павіншаваў Аляксандр Лукашэнка.**

*«Дарагая Даша! Мы ўсе на цябе вельмі разлічвалі і з нецярпеннем чакалі годнае выступленне на біятлоннай трасе Пхёнчхана. Паказаўшы выдатную псіхалагічную ўстойлівасць, ты ў выдатным стылі правяла гонку мас-старту і заваявала «серабро» Алімпіяды!»* — гаворыцца ў віншаванні. *«Дзякуй за гэтую перамогу. Упэўнены, нашы дзяўчаты здольныя паказаць высокі вынік і ў эстафеце. Няхай вам спадарожнічае ўдача!»* — пажадаў Прэзідэнт.

Адзначым, што для Дар'і гонкі з масавым стартам з'яўляюцца самымі паспяховымі, менавіта ў іх яна атрымала больш за ўсё перамог у сваёй кар'еры і заваявала тры малыя Хрустальныя глобусы Кубка свету.

*«Гэта «серабро» з залатым адлівам, без перабольшання. З самага пачатку Алімпіяды настрой быў максімальны. Аднак перашкаджалі розныя фактары: надвор'е, вецер, стральба. Старты тут я запомню надоўга»,* — падкрэсліла біятланістка. Таксама яна адзначыла дапамогу і падтрымку свайго мужа Уле-Эйнара Б'ёрндалена. *«Недзе ён стараўся прамаўчаць, дзесьці пабыць убаку і дазволіць, каб запал маіх эмоцый выйшаў куды-небудзь на сцяну. Падтрымліваў на дыстанцыі, дапамагаў нашым хлопцам у сэрвісе, з тэстам лыж. Стараўся быць карысным нашай камандзе тут. Дзякуй яму за гэта!»*

Сёння Дар'я займае вельмі значнае месца ў гісторыі сусветнага біятлона, за сваю кар'еру яна атрымала 30 перамог на топ-турнірах (сюды ўваходзяць Алімпійскія гульні, чэмпіянаты свету і Кубкі свету), па гэтым паказчыку Домрачава дзеліць трэцюю пазіцыю з немкай Ушы Дызль. І з'яўляецца другой па ліку сярод уладальніц асабістых узнагарод Алімпіяд — 5 медалёў, вышэй за яе толькі трыумфатар цяперашніх Гульняў — Анастасія Кузьміна, у якой 6 узнагарод.

*«Я думаю, варта абмежавацца трыма Алімпіядамі,* — расказвае Дар'я, адказваючы на пытанне пра магчымасць узяць удзел у зімовых Гульнях-2022. — *Пасля гэтай Алімпіяды яшчэ тры этапы Кубка свету, якія таксама хочацца правесці годна. Я цяпер думаю пра гэта. Што буду рабіць потым, падумаю вясной».*

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ

■ Выстаўка

# Маляўнічы шлях да роднай мовы

**Аказваецца, пра родную мову можна гаварыць праз вышыванкі і жывапіс. Такі падыход да таго, каб звярнуць увагу грамадскасці да Міжнароднага дня роднай мовы, у гэтым годзе быў знойдзены супрацоўнікамі Нацыянальнай бібліятэкі.**

У межах святкавання гэтай важнай даты сумесна з грамадскім аб'яднаннем украінцаў «Ватра», мінскім грамадскім аб'яднаннем украінцаў «Заповіт» і таварыствам дружбы народаў «Беларусь — Украіна» «Нацыяналка» падрыхтавала прыгожы выставачны праект. Яго ідэя — паказаць багацце, прыгажосць і непаўторнасць беларускай і ўкраінскай моў, іх непарыўную сувязь з народнай творчасцю.

«Мова — душа народа» — не метафара, спрадвеку яна перадавалася праз песні і казкі, адлюстроўвала сувязь чалавека і навакольнага свету. Так і з вышыванкамі: жанчыны праз каляровыя ўзоры на белай тканіне таксама размаўлялі, дзяліліся пачуццямі. І як у кожным рэгіёне розняцца арнаменты, так і з гаворкай людзей. «Літаратурная мова, філолагі ведаюць, — мёртвая. Мова жывая ў дыялектах, дзе па-іншаму вымаўляецца нейкі гук, дзе пануюць адметныя словы. І таму ў кожнай мясцовасці яна пачынае гучаць інакш», — заўважыў **намеснік дэкана па навуковай рабоце філалагічнага факультэта БДУ Павел НАВОЙЧЫК** падчас адкрыцця выстаўкі «Маляўнічыя арнаменты родных моў».

А можа, сапраўды, калі мы хочам, каб часцей гучала родная мова, павінны яе падаваць новаму пакаленню праз нашу багатую, цікавую культуру, уводзіць у дзіцячы і маладзёжны асяродак разам з нацыянальнымі гульнямі і спевамі, традыцыйнымі рамёствамі і тымі ж вышыванкамі?

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ

■ Грошы

# Даходы павялічыліся на 2,4 %

**Рэальныя грашовыя даходы насельніцтва ў мінулым годзе склалі 102,4 % да ўзроўню 2016 года, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

У агульным аб'ёме грашовых даходаў заробкі займаюць 62,9 %, даходы ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці — 8,1 %, пенсіі, дапамогі, стыпендыі і іншыя трансферты насельніцтву — 23,7 %, даходы ад уласнасці і іншыя даходы — 5,3 %. Дарэчы, гэта грашовыя даходы за вылікам падаткаў, збораў і ўзносаў, скарэктаваныя на індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі.

Сяргей КУРКАЧ

# ЁСЦЬ ПЫТАННЕ ПА ПРАЦОЎНЫМ ПРАВЕ?

**22 лютага любы ахвотны зможа бясплатна атрымаць кансультацыю прафсаюзных юрыстаў па пытаннях, звязаных з абаронай працоўных і сацыяльна-эканамічных правоў і інтарэсаў. Пры неабходнасці і па жаданні таго, хто атрымлівае кансультацыю, для вырашэння пытання могуць быць прыцягнутыя пракуроры.**

Час і месца прыёму ў вашым раёне або горадзе можна даведацца з 19 па 21 лютага па тэлефонах у рэгіёнах:

Брэсцкае абласное аб'яднанне прафсаюзаў — (80162) 21-56-43;

Віцебскае абласное аб'яднанне прафсаюзаў — (80212) 35-87-71;

Гомельскае абласное аб'яднанне прафсаюзаў — (80232) 32-90-85;

Гродзенскае абласное аб'яднанне прафсаюзаў — (80152) 72-34-91;

Магілёўскае абласное аб'яднанне прафсаюзаў — (80222) 25-36-52;

Мінскае абласное аб'яднанне прафсаюзаў — (8017) 323-39-23;

Мінскае гарадское аб'яднанне прафсаюзаў — (8017) 203-89-37.

У першую чаргу такой кансультацыяй могуць скарыстацца члены прафсаюзаў, якія ўваходзяць у ФПБ, аднак яна можа быць атрымана таксама ўсімі, хто сутыкнуўся з парушэннямі заканадаўства аб працы. Пры гэтым не мае значэння, працуе чалавек у дзяржаўнай альбо ў прыватнай арганізацыі.

Рэспубліканскі прафсаюзны прававы прыём грамадзян праводзіцца ў рамках праекта: кожны апошні чацвер месяца ФПБ прапануе бязвыплатную юрыдычную дапамогу ўсім, хто мае ў ёй патрэбу.

Святлана БУСЬКО.

■ Сувязь

# Размовы па мабільным падаражэюць

**Аператар velcom анансаваў павышэнне кошту паслуг сувязі.**

У прыватнасці, з 1 красавіка падаражэюць паслугі мабільнай сувязі: павялічыцца абаненцкая плата, кошт званкоў на нумары абанентаў Беларусі, падаражэюць мабільны інтэрнэт, SMS, MMS, аднаразовыя ўзносы, а таксама спецыяльныя і дадатковыя паслугі для фізічных і юрыдычных асоб. Падаражанне, як паведамляе мабільны аператар, не перавысіць 3 %. А з 1 сакавіка зменіцца кошт паслуг на шэрагу тарыфаў фіксаванай сувязі і тэлебачання для прыватных і карпарацыйных кліентаў — павышэнне складзе ў сярэднім 9 %.

Для аптымізацыі тарыфнай лінейкі аказанне паслуг на пэўным пераліку архіўных тарыфных планаў velcom з 1 сакавіка будзе спыненае. Абаненты гэтых тарыфаў могуць перайсці на любы актуальны тарыф на агульных падставах. З 1 сакавіка кліенты, якія не змянілі тарыфны план самастойна, аўтаматычна будуць пераводзіцца на рэкамендаваныя тарыфы.

Змяненне з 1 сакавіка коштаў і ўмоў абслугоўвання некаторых тарыфных планаў анансаваў таксама і сотавы аператар life :), у сярэднім павышэнне складзе каля 6 %. На некаторых архіўных тарыфах разам з коштам вырасце і аб'ём трафіку. Пры гэтым цэны на роўмінг, нацыянальныя SMS і MMS аператар не падымае, не зменіцца і выплаты па растэрміноўцы за набытае абсталяванне.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Здарэнне

# Падчас руху стала дрэнна...

**Машыніст электрычкі памёр на пад'ездзе да Жодзіна.**

Па інфармацыі прэс-цэнтра магістралі, трагічнае здарэнне адбылося 18 лютага на станцыі Жодзіна-Паўднёвае. Машыністу электрычкі Барысаў — Мінск падчас руху стала дрэнна. Яго памочнік выкарыстаў экстраннае тармажэнне, паведаміў дзяжурнай па станцыі, была выклікана хуткая дапамога. Таксама ён шукаў медыка ў электрычцы. Брыгада хуткай медыцынскай дапамогі правяла рэанімацыйныя мерапрыемствы, аднак 45-гадовы машыніст памёр. Чыгуначнікі перасадзілі пасажыраў на іншы састаў, які даставіў іх у Мінск.

Сяргей РАСОЛЬКА

# НЕ ПРАЕХАЦЬ І ЯБЛЫКУ НЕ ЎПАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Такую карціну бачаць увечары жыхары дома на праспекце Незалежнасці, 28.

— Уздоўж праспекта і вуліц устаноўлены дарожныя знакі «Спыненне забаронена», найбліжэйшыя платныя паркоўкі знаходзяцца побач з Палацам Рэспублікі і «Прэзідэнт-атэлем». Наведвальнікі цырка звычайна прыязджаюць па лініі метро. Там таксама ёсць паркоўкі ў крокавай даступнасці, але ж не ўсякі згодны перасесці на «падземку», калі можна даехаць да самага ўвахода на ўласнай машыне, — дзеліцца назіраннямі Аляксандр, мясцовы жыхар, які канфлікт паміж «сваімі» і «чужымі» аўтамабілістамі бачыў, лічы, з самага пачатку. Па яго словах, сітуацыя стала крытычнай яшчэ гадоў дзесяць назад. Па-першае, у мінчан павялічыўся аўтапарк, а па-другое, было забаронена паркавацца побач з Домам афіцэраў.

— Калі б паркоўка «побач з танкам» аднавілася, няхай і на платнай аснове, ахвотных пакінуць там аўто было б даволі. Горад атрымліваў бы грошы, а мы — палёгку, — разважае Генадзь, яшчэ адзін з тых жыльцоў, што вырашылі адстойваць свае правы на парковачнае месца і ўнутрыдваровую бяспеку.

Летам мінулага года на чацвёртым паверсе ў першым пад'ездзе здарыўся пажар. Сусед вывеў жыхароў з кватэры, а пажарнікі вымушаны былі шукаць, якім чынам пад'ехаць да месца здарэння, бо пажарная машына праціснуцца скрозь «калідор» легкавікоў не магла. Але гэта — асаблівы выпадак. Нават вываз смецця са звычайнай паслугі ператвараецца ў выпрабаванне. Бывае, смеццявоз проста не можа даехаць да пляцоўкі з кантэйнерамі, пакеты і дробнае смецце вецер разносіць па акрузе.

Ад няправільнай паркоўкі пакутуюць не толькі нервы, але і маёмасць жыльцоў. У цеснаце лёгка падрапаць як сваю машыну, так і аўто прыезджага. Адсюль — сваркі, пагрозы, грашовыя растраты, пастаянныя размовы з ДАІ. Некаторыя з жыльцоў ставілі самаробныя металічныя слупкі, нацягвалі паміж імі трос ік і такім чынам выгароджвалі лапік для свайго аўтамабіля. Перыядычна з ЖЭСа прыходзілі патрабаванні дэманціраваць незаконныя загароды, але пасля яны ўсё роўна з'яўляліся.

— Мы добра ведаем адзін аднаго і пастаянна трымаем сувязь. Калі мне, напрыклад, не трэба сёння на працу, я тэлефаную суседу і кажу, што ён можа мяне «запіраць». А калі перад маёй машынай прыпаркуецца «чужак», то гадаеш: прыехаў ён сюды на гадзіну, дзень ці тыдзень? — рэзюміруе Аляксандр.

## Праезд скразны ці тупіковы?

Супрацьстаянне інтарэсаў доўжылася гадамі, пакуль у жыльцоў не з'явілася надзея — пастанова Мінскага гарадскога выканкама № 2786, якая спрашчала ўсталяванне шлагбаума пры заездзе ў двор літаральна да трох крокаў.

— Па правілах, праводзіць усталяванне шлагбаума можна, калі з гэтай працэдурай згодны больш за палову жыхароў. На агульным сходзе было сабрана каля 80 працэнтаў подпісаў, «за» выказваліся нават тыя, хто не мае машыны, — успамінае Аляксандр. — Мы выбралі запорны механізм, аплацілі распрацоўку праекта, нанялі прадпрымальніка, які б выканаў установачныя работы...

Аднак узнікла нечаканая перашкода. Пры разглядзе заявы ў гарвыканкаме палічылі, што двор на Купалаўскай мае скразны праезд і падпарадкоўваецца іншым правілам карыстання, якія не дазваляюць усталёўваць перашкоды для транспарту. Жыхары з такім вердыктам не згодныя і вось ужо дзесяць гадоў вядуць перапіску з рознымі інстанцыямі. Лістоў і адказаў на іх сабраўся цэлы стос, прычыны для адмовы ўзнікалі розныя, а справа так нікуды і не зрушылася.

У лютым пытанні ўпарадкавання аўтамабільнага руху ў дварах абмяркоўвалі падчас прэс-канферэнцыі прадстаўнікі зацікаўленых арганізацый. Напрыклад, **Сяргей МАСЛЯК, старшыня Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя,** адзначыў, што тэма парковак адна з пастаянных, хоць і не асноўная для яго супрацоўнікаў:

— У межах гэтай праблемы намі была ініцыіравана пастаянная акцыя «Я паркуюся, як...» На першым этапе з жыхарамі праводзяць інфармацыйную кампанію разам з мясцовымі органамі ўлады, ЖКГ Мінгарвыканкама, мясцовымі ЖРЭА і супрацоўнікамі ДАІ. Адміністрацыя раёна прапануе грамадзянам некалькі рашэнняў па парковачных месцах. Аднак трэба разумець, што, каб іх ажыццявіць, патрэбны фінансавыя выдаткі, 80 працэнтаў якіх кладуцца на жыхароў. Пасля першага этапу няправільна прыпаркаваныя аўтамабілі вывозім з дапамогай эвакуатара і ў прысутнасці работнікаў ДАІ. Парушальнікі могуць атрымаць штраф.

Па назіраннях старшыні камітэта, прыкладна 95 працэнтаў мясцовых ініцыятыў заканчваюцца на этапе мітынгу. Аднак **Галіна ГІЛЕВІЧ, намеснік генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні, санітарным утрыманні жыллёвага фонду ГА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка»,** адзначае, што мінчане сталі не толькі актыўней выказваць меркаванні па добраўпарадкаванні прыдамавой тэрыторыі, але і прапаноўваць добраўпарадкаванне за кошт уласных сродкаў.

## Праект даражэйшы за шлагбаум

Атрымліваецца, гараджане гатовыя плаціць за паслугу, калі яна зробіць жыццё больш камфортным. І тут трэба згадаць яшчэ адну дэталь. Набыццё і ўсталяванне шлагбаума аплачвае той, хто падае заяву. Ён жа павінен прафінансаваць распрацоўку праекта — гэта абавязковая ўмова для правядзення зямельна-будаўнічых работ. Уся праблема ў тым, што гатовы праект часам каштуе ўдвая больш, чым сам шлагбаум.

— Знайсці патрэбны запорны механізм цяпер не перашкода. Можна падабраць даўжыню, тып дзеяння, хуткасць пад'ёму. Іншая рэч, што праект, кошт тэхнікі, яе ўсталяванне для многіх жыльцоў стануць значнымі выдаткамі, — разважае **Сяргей САХАР, дырэктар кампаніі — афіцыйнага прадстаўніка італьянскага вытворцы тэхнікі.** — Таксама хацеў бы сказаць пра этап узгаднення ўсталявання шлагбаума. У нашу кампанію тэлефануюць кліенты, якія сутыкнуліся з цяжкасцямі. Было б зручна вырашаць усе пытанні не выходзячы з аднаго будынка, каб службы маглі пракансультаваць заяўніка ў непрадбачаных выпадках.

Яскравая лічба: 800 тысяч транспартных сродкаў зарэгістравана ў Мінску, па даных ДАІ. У далейшым колькасць машын наўрад ці паменшыцца, так што методыка, якую прапанаваў **Алег ЛЯШЧЫНСКІ, дырэктар ДУ «Паркоўкі сталіцы»,** падаецца асабліва цікавай. Яе сутнасць — адпрацоўка абароны прыдамавых тэрыторый, дзіцячых дашкольных, медыцынскіх устаноў, што размяшчаюцца побач з платнымі аўтамабільнымі паркоўкамі. Напачатку ўсе дваровыя тэрыторыі на выбраных вуліцах трапляюць у зону інфармавання. Уладальнікаў аўтамабіляў папярэджваюць пра пачатак мерапрыемстваў праз інфармацыйныя лісты. За два-тры тыдні грамадзяне павінны паведаміць, хто жыве або працуе непадалёку. Сфарміраваны «спіс доступу»



У «архівах» некаторых жыльцоў можна адшукаць адказы службаў на запыты яшчэ з 2007 года.

ўзгадняецца з адміністрацыяй раёна, пасля чаго дваровыя тэрыторыі абазначаюцца забаранняльнымі дарожнымі знакамі, усталёўваецца сістэма фіксацыі парушальнікаў. Апошнія могуць займець непрыемнасці з ДАІ.

— Наша методыка сябе апраўдала. У мінулым годзе мы адпрацавалі па прывакзальнай плошчы ў раёне вуліц Бабруйскай і Кірава, па вуліцы Чкалава ад вуліцы Варанянскага да Авакяна, і цяпер ідзе інфармаванне ўладальнікаў транспартных сродкаў па вуліцы Карла Маркса. Арыенціровачна, асноўная работа там пачнецца з сакавіка гэтага месяца, — такі прагноз даў Алег Ляшчынскі.

***

Што ж, дом па праспекце Незалежнасці, 28 дзеліць агульны двор з будынкамі па вуліцах Янкі Купалы і Карла Маркса. Магчыма, у сакавіку жыхары нарэшце адчуюць палёгку і ім не спатрэбіцца дабівацца ўстаноўкі шлагбаума... А пакуль пажывём — убачым.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА і з асабістых архіваў жыхароў.**

---

Рынак працы

# ЮРЫСТ — ХОЛАДНА, БУХГАЛТАР — ЦЯПЛЕЙ, ФАРМАЦЭЎТ — ГОРАЧА

## Для Мінска склалі барометр магчымага працаўладкавання

**Спецыялісты прадставілі спіс найбольш і найменш запатрабаваных прафесій, прааналізаваўшы больш за 150 розных кірункаў. У топе па-ранейшаму спецыялісты ў сферы медыцыны, адукацыі і сучасных тэхналогій. Што датычыцца рабочых спецыяльнасцяў, то высокі попыт на кваліфікаваных будаўнікоў, кухараў, трактарыстаў, прадаўцоў. А вось псіхолагам, эканамістам, юрыстам, мадэльерам і ліфцёрам адшукаць «месца пад сонцам» зараз будзе не так проста.**

У будучыні змены закрануць прадстаўнікоў прафесій, якія не патрабуюць спецыфічных ведаў і ўменняў: касіраў, аператараў кол-цэнтраў, кур'ераў, сакратароў і адміністратараў. У буйных гіпермаркетах касіраў заменяць спецыяльныя тэрміналы, а ў кол-цэнтрах з работай змогуць справіцца аператары-робаты, праз 10—15 гадоў можа пачаць знікаць прафесія вадзіцеля, абавязкі якога возьме на сябе аўтапілот. Ужо цяпер шматлікія кампаніі скарачаюць штат бухгалтараў, бо з'яўляюцца новыя праграмныя прадукты, якія аблягчаюць працэсы ўліку.

Спецыялісты па прасоўванні і маркетынгу, камп'ютарным абсталяванні і тэлекамунікацыях, сістэмныя аналітыкі, архітэктары, кіраўнікі сярэдняга звяна на вытворчасці могуць спаць спакойна — іх прафесіі будуць па-ранейшаму запатрабаванымі. Тыя, хто плануе заняцца вывучэннем блокчэйна і крыптавалют, таксама не пралічыліся: попыт на экспертаў у гэтай сферы будзе толькі расці. Тым не менш, як адзначыла **начальнік аддзела рынку працы камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай ахове Мінгарвыканкама Святлана ЛЯВОНЧЫК,** наяўнасць дыплома не гарантуе працоўнае месца і пасяховую занятасць. Наваат тым, у каго ёсць запатрабаваная спецыяльнасць, неабходна паглыбляць веды і цікавіцца інавацыямі. І калі раней аптымізацыя датычылася ў большай ступені рабочых спецыяльнасцяў, то сёння камп'ютарызацыя замяняе і тых, хто працуе ў інтэлектуальнай сферы. Напрыклад, прафесіі юрыстаў, псіхолагаў, эканамістаў у чыстым выглядзе становяцца ўсё менш запатрабаванымі.

Спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і Мінгарвыканкама склалі таксама прагноз сітуацыі на рынку працы сталіцы на 2018 год. У гэтым ім дапамаглі прадстаўнікі Шведскай дзяржаўнай службы занятасці, цеснае супрацоўніцтва з якімі працягваецца ўжо практычна дзесяць гадоў. Мемарандум аб узаемаразуменні з камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама быў падпісаны ў 2015 годзе, цяпер да праекта далучыліся Гродзенская і Віцебская вобласці.

— Мы бачым аддачу ад сумеснай работы. Пытанні занятасці не страчваюць актуальнасць. Праект, які рэалізуецца, накіраваны на арганізацыю больш эфектыўнага ўзаемадзеяння паміж наймальнікамі і службай занятасці. У Швецыі створана сістэма прагназавання рынку працы, якая абапіраецца як на комплексны аналіз макраэканамічных індыкатараў, так і на апытанні работадаўцаў. У цэлым умовы фарміравання, функцыянавання і рэгулявання рынку працы ў нашых краінах адрозніваюцца, але ёсць падобныя моманты. У прыватнасці, і для Швецыі, і для Беларусі характэрныя праблемы скарачэння працоўных рэсурсаў, дысбаланс попыту і прапановы на працоўную сілу, яе нераўнамернае размяшчэнне па тэрыторыі. Вопыт калег запатрабаваны ў нашай краіне, — заўважыў **першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ.**

Даследаванне рынку працы паказала, што ў 2017 годзе яго кан'юнктура палепшылася. Летась працягнулася пераразмеркаванне рабочай сілы са сферы вытворчасці ў сферу паслуг, малога і сярэдняга бізнесу. У параўнанні з 2016 годам палепшыліся паказчыкі руху кадраў, скараціліся аб'ёмы вызвалення работнікаў па ініцыятыве наймальнікаў. Колькасць вакансій, што прадстаўляюцца ў дзяржаўную службу занятасці, павялічылася амаль на 45 %, а сярод рабочых спецыяльнасцяў і ўвогуле вырасла ў два разы. Узровень рэгіструемага беспрацоўя знізіўся на 33,5 %. У цяперашні час заяўлена патрэба больш чым у дзесяці тысячах работнікаў. Узровень беспрацоўя, якое рэгіструецца, складае 0,2 % ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. «З улікам існуючых тэндэнцый прагназуем, што больш за 70 % грамадзян з тых, хто звярнуўся па працаўладкаванне, будуць уцягнуты ў розныя праграмы садзейнічання занятасці, — падкрэсліла **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Таццяна КУДЗЕВІЧ.** — На рэалізацыю актыўных мер садзейнічання занятасці запланавана больш як 4 мільёны рублёў».

**Дар'я КАСКО**

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

№ 4 (88) Вторник, 20 февраля 2018 года Для читателей Беларуси, России, Казахстана, Армении, Кыргызстана

Выходит 2 раза в месяц

Издается с 26 апреля 2014 года

# ВЫСОКИЕ ТЕХНОЛОГИИ ПРИЛАГАЮТСЯ



Фото Сергея НИКОНОВИЧА.

Молодой специалист Павел ЖИЛКЕВИЧ и ведущий инженер Адам ЧЕБОТАРЬ.

**В холдинге «Планар» рассчитывают определить концепцию участия в программе «Безопасность Союзного государства» до конца 2018 года. Об этом сообщил генеральный директор компании Геннадий Ковальчук. По его словам, данная программа в настоящий момент находится на стадии согласования с российскими коллегами.**

*(Окончание на 2-й стр. «СЕ».)*

## НОВОСТИ СОЮЗА

### НА КОНТРОЛЕ

**Совет ЕЭК принял ряд важных решений в конце прошлой недели**

**Так, был одобрен проект Соглашения о порядке обращения в рамках ЕАЭС продукции, требования к которой не установлены техническими регламентами. Как сообщается на сайте комиссии, в этом документе учли лучшие международные и национальные практики. Он устанавливает два механизма обеспечения безопасности. Первый — для продукции, которая входит в единый перечень, но техрегламенты еще для нее не разработаны. Второй — для товаров, не попадающих в этот список.**

Государства пятерки устанавливают в своем законодательстве ответственность за выпуск в обращение опасной продукции, а в случае если выявлены подобные факты, размещают информацию в общих ресурсах интегрированной информационной системы союза. Проект будет на полгода направлен членам ЕАЭС на внутригосударственные процедуры.

Одно из принятых решений касается улучшения обмена сведениями между таможенными органами. Теперь после внесений изменений в положение, касающееся санитарно-эпидемиологического контроля за людьми, транспортом и товарами, перемещаемыми через границу или на таможенной территории ЕАЭС, созданы единые предписания уполномоченным органам, как действовать в случае нарушения. Раньше они руководствовались только национальным законодательством. Обновленный документ обязывает запретить реализацию продукции, которая не отвечает требованиям, и в течение двух рабочих дней проинформировать соответствующие органы государства — члена союза, где находится изготовитель опасного товара. Сведения о продукции, не соответствующей нормам, должны стать основанием для проведения проверки.

Через 180 дней после официального опубликования вступят в силу изменения, внесенные в техрегламент «О безопасности колесных транспортных средств». Он был обновлен с учетом принятых Правил ООН. Кроме того, введены требования по оборудованию автомобилей скорой помощи современными системами помощи больным. Например, салоны «неотложки» классов B и C должны быть оборудованы системой подачи медицинских газов с индикацией значения высокого давления и сигнализацией критических значений давления в системе, а также тележкой-каталкой для размещения основных носилок на приемном устройстве.

**Надежда АНИСОВИЧ.**

■ Наука

# ПРО ЧТО РАССКАЖЕТ ДНК?

## Генетика — на службе у медицины и криминалистики

**Расследовать преступления за лабораторным столом станет возможным благодаря реализации союзной программы «ДНК-идентификация». С российской стороны ее заказчиком выступает Федеральное агентство научных исследований, с белорусской — Национальная академия наук. Кроме белорусских и российских ученых, в реализации программы принимают участие службы судебных экспертиз России и Беларуси, а также медицинские структуры.**

— Программа рассчитана на пять лет (с 2017 по 2021 год). Полное ее название «Разработка инновационных геногеографических и геномных технологий идентификации личности и индивидуальных особенностей человека на основе изучения генофондов регионов Союзного государства», — рассказал **научный руководитель программы, главный ученый секретарь Национальной академии наук Беларуси Александр КИЛЬЧЕВСКИЙ**. — Программа включает два основных блока: исследования в области медицинской генетики и исследования, направленные на развитие криминалистики. Головной организацией и исполнителем программы в Республике Беларусь является Институт генетики и цитологии НАН Беларуси.

Впрочем, нашелся кинотеатр, который не прислушался к решению министерства: московский «Пионер» успел показать комедию пять раз. При этом в то же время у него в прокате был другой фильм о генсеке — «Диван Сталина». Эту картину, в которой снялся Жерар Депардье, показали единожды в рамках международного фестиваля «Наконец-то в кино». В результате, как пишут «Ведомости», по решению мирового суда на прошлой неделе кинотеатр был оштрафован на 80 тысяч российских рублей (почти $1400) за показ французского фильма «Диван Сталина» без прокатного удостоверения. Вопрос о возможном нарушении «Пионером» закона при показе «Смерти Сталина» суд еще не рассматривал.

В Беларуси незадолго до ожидаемой премьеры отменили сеансы и попросили приостановить продажу билетов. Это было сделано, поскольку Министерство культуры решило ознакомиться с фильмом заранее, до выхода в прокат. Это нормальная практика, однако часто комиссия смотрит киноленту вместе со зрителями на первом сеансе и дает заключение. В итоге эксперты пришли к выводу, что лента не нарушает законодательства Беларуси, и пустили ее в прокат.

Казахстанские кинотеатры сами отказались от показа фильма. Однако единожды его все-таки удалось посмотреть в Алматы в рамках Clique Film Festival. Кыргызстанские кинотеатры также заявили, что пока не планируют покупать ленту. В Армении фильм вышел в прокат по расписанию.

**Надежда АНИСОВИЧ.**

СЕ СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

Учредитель и издатель: редакционно-издательское учреждение «Издательский дом «Звязда».

Директор — главный редактор СУХОРУКОВ Павел Яковлевич.

Ответственная за выпуск: Н. Анисович.
Свидетельство о государственной регистрации средства массовой информации № 1701 от 31.03.2014 выдано Министерством информации Республики Беларусь.

Адрес: ул. Б. Хмельницкого, 10а, 220013, г. Минск.
Телефоны: 287 17 21, 292 31 21.
www.zviazda.by, e-mail: info@zviazda.by.

Республиканское унитарное предприятие «Издательство «Белорусский Дом печати». ЛП № 02330/106 от 30.04.2004.
Пр. Независимости, 79, 220013, Минск.

Тираж 20.008 экз. Заказ 725.
Номер подписан 19.02.2018 в 19.30.

■ Жыццёвінкі

# БЕДАВАЦЬ — БЕДАВАЛІ, АЛЕ ПРА ЖАРТЫ НЕ ЗАБЫВАЛІ

З Фундамінкі Буда-Кашалёўскага раёна, дзе наша сям'я ў час вайны знаходзілася ў бежанцах, мы вярнуліся ў родныя мясціны, у Чачэрск, ушчэнт знерваваныя, з цяжэнным камянюкам на душы: замест хаты — папялішча, пасярод якога сумна і адзінока тырчалі абгарэлыя рэшткі пячной трубы. У бацькі і маткі адразу ж роспачна зашкраблося ў галаве: дзе прытуліцца? Як жыць? З аднагадовай хворай Марусяй сем чалавек нас. У вялікай трывозе Андрэевіч і Кірылаўна пабрылі па вуліцы ў разведку. А там — воку няма як зачапіцца за якуюсь будыніну. Бо ўсё — мёртвае. У шэрым і чорным попеле, у галавешках. І зусім, нечакана ўжо (от радасць!) побач з высокай разгалістай ліпай — домік. Стаіўся, схаваўся і на свет як бы горда і здзіўлена паглядвае: маўляў, вось я! Нашых бабы Мар'і і яе другога мужа дзеда Майсея (першы, Кірыл, ад якога мая маці, загінуў у час Першай сусветнай вайны) домік. Цалюсенькі!

Не буду распавядаць, якой цёплай была сустрэча з роднымі, як мы ўладкаваліся там, але зазначу наступнае. У домік-хатку набілася каля трыццаці чалавек. І ўсё — радня. Спалі хто дзе: на ложках, на лавах, на печы, а больш за ўсё — покатам, бокам у бок, на падлозе. У цеснаце, ды не ў крыўдзе. Тое ж самае, ведаю, было і ў іншых ацалелых хатах: гора аб'ядноўвала, згуртоўвала народ, выкоўвала ў людзях цярплівасць, спачуванне, дабрыню, павагу адзін да аднаго.

Названай вышэй катэгорыі люду, вядома ж, пашанцавала. А колькі ж было гаротнікаў, у якіх ні хаты, ні радні, ні кала, ні двара! Многа! У спешцы закопваліся яны ў зямлю, ладзілі там жытло. Сырое, вільготнае, няўтульнае, але ўсё ж жытло. З бясконцай надзеяй на будучае. На лепшае.

Тая ж надзея цяпліла душы і нашай сям'і, якая да вайны (бацькі расказвалі) займала прасторны, з прыгожым і вясёлым фасадам на вуліцу, дом. Пасярод агарода, на самым высокім месцы яго, засталася недабудаваная, дзядзькі Конкі, хаціна. Яна была з франтонамі пад дахам і нават са столлю. Немцы ўсцягнулі на яе гармату і абстрэльвалі адтуль пазіцыі чырвонаармейцаў. Да вайны дзядзька некалькі гадоў вадзіў у Ленінградзе трамваі, пакуль пад яго колы не трапіла адна жанчына. Якая віна яго ў гэтым была, мы не ведалі, але, хоць справа да суда тады не дайшла, ён вымушаны быў сабраць манаткі, вярнуцца на радзіму і ўзяцца за тое будаўніцтва. А потым ён, халасцяк, апынуўся на фронце. Ва Украіне трапіў у палон, з якога ўцёк да партызанаў, а праз некаторы час — зноў палон, з групай народных мсціўцаў. Як фашысты ні катавалі іх, як ні прымушалі прызнацца, дзе базіруецца іх атрад, але так нічога ні ў кога не здабылі. І тады партызанаў загналі ў лазню, забілі акенцы і дзверы ў апарню і пад пагрозай расправы загадалі гаспадару падворка паліць і паліць у печы, што той і рабіў. Раніцай выявілася, што ад чаду там усе і паатручваліся. Пра гэта нашаму бацьку ў пісьме паведаміў той чалавек, пасля чаго Андрэевіч зразумеў, што трэба брацца за гэту хату самому, бо яна ўжо — наша. А пакуль жылі ў бабы і дзеда.

Аб апошнім маю ахвоту даць некалькі штрышкоў, бо асоба гэта даволі каларытная. Высачэзны, размашысты ў плячах, з адной чамусьці завушніцай. І яшчэ. Указальны палец яго левай рукі тарчмака ўссядаў на сярэдні палец. Але, нягледзячы на гэта, дзед быў адмысловым майстрам сталярнай і цяслярнай справы. Калі народ пачаў адбудоўвацца, ён быў нарасхват. У мае абавязкі ўваходзіла насіць яму гарачыя абеды, і тады бачыў я яго моц. Пры распілоўцы на спецыяльным прыстасаванні бярвенняў ён заўсёды стаяў уверсе і падганяў таго мужыка, што быў унізе: давай-давай! У абед без часнаку не абыходзіўся, а калі, было такое, гаспадар падносіў работнікам чарку, ён ніколі не адмаўляўся ад яе. Адзін глыток — і няма цэлай шклянкі самагонкі. Яго ж кампаньёнам такое было не пад сілу. Дзед Майсей пайшоў на той свет на дзясятым дзясятку, намнога перажыўшы бабу. Людзі дзівіліся: усе зубы ў яго былі цалюткія, пэўна, ад таго часнаку, а вось вочы яго ўжо нічога не бачылі. Пэўна, ад той празмернай натугі, якая выпала на яго долю.

Дзед дапамог прывесці нашу хату ў парадак, і мы ўлезлі ў яе куды раней, чым іншыя. Яна была на дзве палавіны, з прыбудаванымі пасля ўжо талакой сенцамі і хлявамі.

Часцяком доўгімі асеннімі і зімнімі вечарамі, калі ззаду заставалася заўважна менш хатніх і калгасных спраў, у нашым доме сабіралася цэлая гурба людзей, да дваццаці і больш жанчын і мужыкоў з зямлянак, бліндажоў і незакончаных халодных будынін, дзе ўжо з горам папалам можна было туліцца. Сярод іх: сват Міхась з калматымі, як у Брэжнева, брывамі, які прыхопліваў з сабой жонку Куліну і (добра памятаю) на народзе нязменна называў яе "асінавая папірашка", і яна на гэта ні грама не крыўдзілася і толькі кудлачыла яго чупрыну; а таксама наш дзядзька Санька з ціхенькай і прыветнай "палавінкай" Лісаветкай. Усе ўсаджваліся на лаўкі і нетаропка дзяліліся навінамі, вялі рознага роду размовы, лушчылі гарбузовыя семкі, а іншым разам напаўголаса спявалі.

Бацька ж, яго сябар з дзяцінства Люха, Васіль Малец і Іван Сэкун, якога заўсёды суправаджала здаравенная нямецкая аўчарка Рэкс, займалі месца за сталом. Гэтая заядлая чацвёрка азартна рэзалася ў "тысячу", а некалькі разявак-балельшчыкаў, прымасціўшыся на чым-небудзь збоку або проста стоячы, цікавалі за карцёжнікамі.

Мужыкі смакталі самакруткі, смярдзючыя і тытунёвыя дымы якіх ірванымі аблачынкамі плылі да столі і туманілі памяшканне. Жанчыны маўчалі да таго часу, пакуль, здавалася, не было ўжо чым дыхаць, і пачыналі выказваць свае прэтэнзіі: майце сумленне. Хто-небудзь з мужыкоў прыадчыняў дзверы ў сенцы, і скразнячок рабіў сваю справу. А курцы зноў смалілі, і зноў паўтаралася тое ж самае.

Нярэдка гульня заканчвалася апоўначы. І ніхто раней гэтага не разыходзіўся. Бо напярэдадні, ведалі, цікавая інтрыгуючая развязка. І вось яна, жаданая. Пераможца громка называе імёны аўтсайдараў і раіцца з публікай, з чаго пачынаць?

— З гаўкання! — дружна чуецца ў адказ.

Лідар заганяе першага няўдачніка пад лаву, дзе прымасціліся жанчыны, і загадвае:

— Пакажы, што робіць Хведзькава сучка, калі зашчэміцца ў Пракопавым плятні.

І той танюсенькім дыскантам то скуголіць, напускаючы на гледачоў-слухачоў сумныя матывы, то нібы заліваецца енкам-плачам з усімі прыдуманымі ім нюансамі. І гэтак паўтараецца столькі разоў, колькі «балаў» не дабраў няўдачнік.

— А ну ўяві сабе, што ты Рэкс, — дае каманду лідар другой «ахвяры».


mikashevichi.ru

Той становіцца на карачкі, і з яго вырываецца такі громкі і грозны бас, што прыкімораны пад сталом Рэкс ускопліваецца з месца і сваімі разумнымі вачыма пачынае шукаць «калегу»-канкурэнта.

А трэці "артыст" так выводзіць у комінкавую трубу нудную піліпаўскую воўчую песню, што Рэкс натапырваецца і нервова б'е хвастом па падлозе.

А то яшчэ разыгрывалася камедыя «Язда на жарабку». Пераможца, пераўвасобіўшыся ў Аляксандра Македонскага ці Чапаева, залазіў на «каня» і рысцю ці галопам пускаўся на ім ад акна да парога і назад, размахваючы «кап'ём» ці «шабляй», а другой рукой ухапіўшыся за чупрыну ці вуха няўдачніка. Зацугляная «жывёліна» то адчайна падбрыквала, то скубла траўку, то прыпадала «пысай» да вадзіцы, то спрабавала ўкусіць ездака за нагу, то падала ў знямозе, каб адпачыць. Усё залежала ад каманды лідара і фантазіі самога аўтсайдара.

Ці трэба казаць, паважаныя чытачы, які рогат стаяў у хаце ад гэтых вясёлых, гумарных відовішчаў, як узнімаўся настрой людзей, хоць няхай сабе і на кароткі час, прэч адганяючы ад іх клапотныя думкі нялёгкай пасляваеннай паўсядзённасці. З тым і разыходзіліся, каб праз некалькі дзён зноў сысціся тут і трохі падурэць-пашуткаваць. Настроіць сябе на аптымістычны лад.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ**

■ Сугучча

## КУПАЛА КРОЧЫЦЬ ПА СВЕЦЕ

**У пярэдадзень чарговага Мінскага міжнароднага кніжнага кірмашу-выстаўкі выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» адправіла ў друкарню па-свойму ўнікальную кнігу. Пад адной вокладкай выдання «А хто там ідзе: на мовах свету» сабраны 101 пераклад легендарнага верша народнага песняра Беларусі Янкі Купалы. «А хто там ідзе, а хто там ідзе/ У агромністай такой грамадзе?/ — Беларусы.»**

Абазінская, абхазская, аварская, агульская, азербайджанская, албанская, алтайская, англійская, арабская, армянская, асецінская, ахвахская, балгарская, балкарская, баскская, башкірская, валійская, венгерская, вепская, в'етнамская і іншыя мовы народаў свету (вялікія і малыя мовы жыхароў нашай планеты з розных яе куточкаў!) сталі праваднікамі неўміручых слоў Янкі Купалы. Вялікага паэта, да нядаўняга юбілею якога Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка прамовіў наступныя словы: «Зорка Янкі Купалы ўзышла ў пераломную эпоху, калі Беларусь рабіла першыя крокі да ўласнай дзяржаўнасці. Сілай свайго таленту паэт вызначыў шляхі развіцця роднай мовы і культуры, акрэсліў духоўныя арыенціры многім пакаленням...»

Складальнікі выдання — прафесар, доктар філалагічных навук Вячаслаў Рагойша і дырэктар Літаратурнага музея Янкі Купалы Алена Ляшковіч. Прадмову да кнігі напісаў міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Макей. Ёсць у прадмове і наступнае перакананне: «Упэўнены, што пераклад гэтага выбітнага верша на шматлікія мовы свету будзе спрыяць лепшаму разуменню гістарычнага мінулага беларускага народа, яго надзей і мар, яго душы»

## Сучасныя пісьменнікі — дзецям

**У дзень выбараў дэпутатаў у мясцовыя саветы ААТ «Белкніга» наладзіла акцыю «Сучасныя пісьменнікі — дзецям».**

Паэты, празаікі, якія пішуць для дзяцей, прыйшлі на сустрэчу са школьнікамі ў мінскую гімназію № 29. Пакуль дарослыя галасавалі, выконвалі свой грамадзянскі абавязак, хлопчыкі і дзяўчынкі мелі магчымасць пагутарыць з казачніцай Кацярынай Хадасевіч-Лісавой, паэтамі Ірынай Карнавухавай, Віктарам Ляскоўскім, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь галоўным рэдактарам часопіса «Вясёлка» Уладзімірам Ліпскім. Дарэчы, яшчэ за тыдзень перад нядзельнымі сустрэчамі ў гімназіі працавала кніжная выстаўка, прысвечаная творчасці менавіта гэтых аўтараў. Юныя чытачы мелі магчымасць падрыхтавацца да сустрэч, прачытаць творы літаратараў, якія пасля вялі дыялог з вучнямі. А непасрэдна ў нядзелю «Белкніга» арганізавала ў гімназіі шырокі кніжны гандаль.

Настрой, які панаваў у гэты дзень у гімназіі, пераконвае, што такі фармат зносін пісьменнікаў са школьнікамі патрабуе пашырэння.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

| Лот № | Інв. № | Наименование предмета аукциона, год изготовления | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| **Оборудование, расположенное по адресу:** Витебская область, Полоцкий район, Экиманский с/с, 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе | | | | |
| 19 | 31800 | Агрегат сварочный АДД 4002 М2, 2006 г. в. | 1 056,00 | 52,80 |
| 20 | 31801 | Агрегат сварочный АДД 4003, 2000 г. в. | 912,00 | 45,60 |
| 21 | 05063 | Дистилятор | 60,00 | 3,00 |
| 22 | 00086 | Измеритель дымности отработавших газов МЕТА-01 МП.01, 2009 г. | 118,60 | 5,93 |
| 23 | 31798 | Сварочный аппарат JASIC ARC-140, 2007 г. в. | 9,60 | 0,48 |
| 24 | 05071 | Станок шлифовальный 3К-634, 1987 г. в. | 60,00 | 3,00 |
| 25 | 05061 | Стенд Р-770, 1991 г. в. | 309,60 | 15,48 |
| 26 | 05053 | Тележка Э-312, 1991 г. в. | 38,40 | 1,92 |
| 27 | 31816 | Трансформатор ТДМ-403 У2 | 64,80 | 3,24 |
| 28 | 41227 | Автоматический станок для резки штапика СКУ-501 | 582,60 | 29,13 |
| 29 | 42020 | Выпрямитель V-160 S, 2006 г. в. | 68,00 | 3,40 |
| 30 | 42021 | Выпрямитель дуговой сварки ВДМ-1202С, 2007 г. | 273,00 | 13,65 |
| 31 | 47228 | Комплект тензометрии BSS-2t с индикаторм Ci 6001 | 38,40 | 1,92 |
| 32 | 47197 | Машина испытательная ИП-100, 1994 г. в. | 1 011,60 | 50,58 |
| 33 | 40221 | Парогазогенератор ПГГ-2 | 864,00 | 43,20 |
| 34 | 40015 | Сварочный аппарат ВДМ-1201, 1991 г. | 184,80 | 9,24 |
| 35 | 41228 | Станок для зачистки углов профиля КТ-504/2, 2009г. | 1 212,00 | 60,60 |
| 36 | 41044 | Станок настольно-сверлильный ВШ-029 | 696,00 | 34,80 |
| 37 | 41048 | Станок правильно-отрезной СМЖ 357К | 792,00 | 39,60 |
| 38 | 42069 | Станок точечной сварки МТ16/18, 1991 г. | 676,80 | 33,84 |
| 39 | 44095 | Станок шлифовальный 3К-1334 | 184,80 | 9,24 |
| 40 | 00464 | Трансформатор сварочный ТДМ-252 У2 | 74,40 | 3,72 |
| 41 | 41065 | Установка горизонтальная СМЖ-54А | 1 608,00 | 80,40 |
| 42 | 40024 | Установка прогрева бетона КТП ТО 80-86 У1, 1996 г. в. | 275,40 | 13,77 |
| 43 | 70223 | Шкаф металлический, 2000 г. в. | 53,60 | 2,68 |
| 44 | 8911 | Блок-контейнер | 729,20 | 36,46 |
| 45 | 8907 | Блок-контейнер «Душевые кабины женские» | 1 434,40 | 71,72 |
| 46 | 30004 | Нивелир НИ-3, зав. № 2359 | 84,00 | 4,20 |
| 47 | 00506 | Теодолит 3Т5КП | 302,40 | 15,12 |
| 48 | 04130 | Штукатурная станция СШ-6 | 1 128,00 | 56,40 |
| 49 | 04131 | Штукатурная станция СШ-6 | 984,00 | 49,20 |
| 50 | 00485 | Блок снижения напряжения БСН 1 СУ3, 2008 г. в. | 57,60 | 2,88 |
| 51 | 00486 | Блок снижения напряжения БСН 1 СУ3, 2008 г. в. | 57,60 | 2,88 |
| 52 | 01207 | Очиститель высокого давления Kranzle 800 TS T | 432,00 | 21,60 |
| 53 | 01138 | Станция прогрева бетона ТСД 3-80/0,38 У3 | 613,80 | 30,69 |
| 54 | 01139 | Станция прогрева бетона ТСД 3-80/0,38 У3 | 613,80 | 30,69 |
| 55 | 00490 | Трансформатор НТС 2.5У, 2011 г. в. | 31,20 | 1,56 |
| 56 | 00491 | Трансформатор НТС 2.5У, 2011 г. в. | 31,20 | 1,56 |
| 57 | 00463 | Трансформатор ТДМ-403У2, 2008 г. в. | 64,80 | 3,24 |
| 58 | 01129 | Установка для приготовления и выдачи раствора УПР-3 | 2 224,80 | 111,24 |
| 59 | 01130 | Установка для приготовления и выдачи раствора УПР-3 | 2 224,80 | 111,24 |

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY**

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 13.00 до 14.00. **По лотам №№ 19–26** ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, тел. +375 29 212-15-01. **По лотам №№ 27–49** ответственное лицо: Зызников Виктор Иванович, заведующий базой, тел. +375 33 677-45-09. **По лотам №№ 50–59** ответственное лицо Свердлов Михаил Данилович, ведущий энергетик, тел. +375 29 516-31-13

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: по лотам №№ 1–13**: не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи (если иное не предусмотрено договором купли-продажи).
**По лотам №№ 14–59** при цене продажи предмета аукциона в сумме до 49 999,99 BYN – срок оплаты не более **10** (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи. При цене продажи предмета аукциона в сумме свыше 50 000,00 BYN – срок оплаты не более **20** (двадцати) дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 03.02.2018 г.

Дата и время проведения аукциона: 06.03.2018 г. в 13.00 по адресу: РУП «СМТ № 22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54, актовый зал

**Дата и время окончания приема документов: 02.03.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Контактные телефоны: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42.**
**Email: auction@cpo.by**

**Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж»**, расположенное по адресу: 246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8-А, настоящим информирует, что на основании решения наблюдательного совета от 16 февраля 2018 года протокол № 18 осуществляется формирование реестра акционеров общества по состоянию на 9 марта 2018 года для проведения очередного общего собрания акционеров 29 марта 2018 года.

УНП 400052115

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БРЕСТОБУВЬТОРГ»

| Предмет торгов | Начальная цена без НДС, рублей | Размер задатка, рублей |
|---|---|---|
| Лот № 1. Изолированное помещение (инв. №100/D-69009), общей площадью 141,6 кв. м, (назначение: помещение, не относящееся к жилищному фонду; наименование: помещение № 21 здания блока подсобных помещений, расположенный по адресу: г. Брест, ул. Янки Купалы, 100, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001007263, площадью 3,3502 га | 23 660,00 | 1 560,00 |

| | |
|---|---|
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Организатор торгов** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/сч для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 23 марта 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 23 марта 2017 г. до 10.00**

**ОАО «Минскгрузавтотранс» извещает своих акционеров о проведении 29 марта 2018 года очередного (годового) общего собрания акционеров**

**Повестка дня**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2017 году и основных направлениях деятельности Общества на 2018 год.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета Общества в отчетном периоде.
3. О результатах проверки аудитором и ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2017 году.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества за 2017 год.
5. О распределении чистой прибыли и выплате дивидендов за 2017 год, утверждение направлений использования чистой прибыли на 2018 год.
6. Установление размера материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии, избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. О перечислении части прибыли в инвестиционный фонд Министерства транспорта и коммуникаций Республики Беларусь.

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2. (2-й этаж, к.11).

Начало собрания в 15.00.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2, комн. 11) в рабочие дни в период с 16 по 28 марта 2018 года с 8.30 до 13.30, а в день проведения собрания – в помещении, где оно проводится.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 14.00 до 14.45 в день и по месту проведения собрания – по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а для представителя акционера – также доверенности или договора.

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании данных реестра акционеров по состоянию на 3 марта 2018 года.

Справки по тел. (8 017) 222-98-24.

Наблюдательный совет ОАО «Минскгрузавтотранс».

УНП 100028545

**Управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Лантан» (УНП 300072791)**

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот № 1. Грузовой бортовой тентовый GAZ 330210, 1996 г. в., регистрационный номер – ВМ0263.<br>Начальная стоимость – 729 белорусских рублей.<br>Лот № 2. Токарный станок Е3N-01, инвентарный номер – 1410592.<br>Начальная стоимость – 1260 белорусских рублей.<br>Лот № 3. Станок токарный 1К62, инвентарный номер – 1410329.<br>Начальная стоимость – 1170 белорусских рублей.<br>Лот № 4. Мельница шаровая, инвентарный номер – 1415836.<br>Начальная стоимость – 2520 белорусских рублей.<br>Лот № 5. Станок заточной, инвентарный номер – 1415845.<br>Начальная стоимость – 153 белорусских рублей |
| Наличие обременений | Не имеется |
| Местонахождение имущества | Витебская область, Оршанский р-н, г. п. Ореховск, ул. БелГРЭС, 37а |
| Место, дата и время проведения торгов | 12.03.2018 в 12.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.5 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1). Судебный исполнитель – Богданова Ольга Евгеньевна, тел./факс (80212) 62 03 40, (8033) 6879163. www.vitebskjust.gov.by |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BICAKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 07.03.2018 г.<br>Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

■ Еўрабачанне-2018

# Пад беларускім сцягам, з англійскім тэкстам і ўкраінскім пашпартам

## За Беларусь на «Еўрабачанні» спяе артыст ALEKSEEV

**У ноч з 16 на 17 лютага прайшоў фінал беларускага нацыянальнага адбору на міжнародны песенны конкурс «Еўрабачанне». Упершыню за 15 гадоў нашу краіну на еўравізійнай сцэне прадставіць замежнік — украінскі спявак ALEKSEEV. Менавіта ён, атрымаўшы максімальную ацэнку ад прафесійнага журы і найбольшую колькасць галасоў гледачоў, стаў пераможцам адбору і нашым музычным дэлегатам у партугальскім Лісабоне.**

24-гадовы артыст уразіў публіку і суддзяў не толькі перапрацаванай англамоўнай песняй Forever, але і эфектнай пастаноўкай нумара, у якой выкарыстоўвалася светлавая інсталяцыя на экранах і касцюме-дысплеі. Зрэшты, наўрад ці толькі светлавое шоу і сцэнічны ўбор выканаўцы дапамаглі яму набраць 12 балаў ад журы і 5184 глядацкія галасы — значна больш, чым у найбліжэйшых канкурэнтаў, электроннага фолк-гурта Shuma (3042 галасы) і спевака Кірыла Гуда (1359).



**Мікіта Аляксееў — ураджэнец Кіева, музыкай пачаў займацца яшчэ ў дзяцінстве, некалькі разоў удзельнічаў у адборы на дзіцячае «Еўрабачанне», але перамогу не атрымаў. Выступаў у складзе ўкраінскага гурта «Сова». У 2014-м удзельнічаў у тэлешоу «Голас краіны», але далей першага тэлеэфіру не прайшоў. У 2015-м з хітом «П'янае сонца» атрымаў шэраг музычных узнагарод у Расіі і Украіне, а таксама ўвайшоў у топ-100 сусветнага чарта Shazam. Летась быў названы «Артыстам года» ў Беларусі па выніках музычнай прэміі БелМузТБ «Наша ліга».**

Чаканы факт перамогі заезджага артыста, які раней ледзь не выбыў са скандалам з адбору з-за парушэння правіла тэрмінаў апублікавання конкурснай песні, выклікаў хвалю каментарыяў у сацыяльных сетках. Беларускія ўдзельнікі выказвалі свае эмоцыі па-рознаму. Гюнеш, якая па суме галасоў публікі і журы падзяліла другое месца з гуртом Shuma, стрымана адзначыла, што цалкам задаволеная сваім выступленнем. Лідар гурта Shuma Руся Шукюрава выказала павагу артыстам, якія працуюць, нягледзячы на абставіны. А вось кампазітар і прадзюсар Яўген Алейнік прапанаваў калегам па цэху рэальна дзейнічаць, каб нарэшце пацвердзіць сваю канкурэнтаздольнасць з замежнікамі. Ягоная ідэя — раз на месяц ладзіць жывы зборны канцэрт-Europarty, каб «усе жыўцом граючыя і спяваючыя ўдзельнікі адбору Беларусі маглі збірацца ды іграць свае праграмы», каб музычны рух быў круглы год, а не толькі раз на год.

Канешне, многім заўзятарам конкурсу даволі крыўдна ўсведамляць, што наша краіна сёлета стане не больш як трамплінам для далейшай раскруткі заезджага гастралёра Мікіты Аляксеева. З іншага боку, грошы артыст і яго каманда будуць траціць свае, а нам як гледачам яго папулярнасць у постсавецкіх краінах дае падставы, нарэшце, разлічваць на больш-менш прыстойнае месца Беларусі на песенным еўрафоруме. І тут асабіста я не зайздрошчу, а хутчэй спачуваю маладому выканаўцу. Бо ён новенькі і не ведае нашай улюбёнай традыцыі: калі вынік на «Еўрабачанні» акажацца нездавальняючым (як мінімум нявыхад у фінал), учарашнія прыхільнікі не паглядзяць на былыя заслугі і зменяць любоў на нянавісць.

Дарэчы, правілы міжнароднага конкурсу дазваляюць любому выканаўцу прадставіць любую краіну, незалежна ад грамадзянства. Вось толькі некалькі з мноства прыкладаў «легіянераў». У 2016 годзе Аўстралію прадставіла этнічная карэянка Дамі Ім; ад Расіі ў 2009 годзе выступала ўкраінка Анастасія Прыходзька. У 1988 годзе Люксембург прадстаўляла бельгійка Лара Фабіян, а Швейцарыю — канадская спявачка Селін Дыён, якая выйграла конкурс і здабыла сабе неверагодную папулярнасць у свеце. А ўсё за той жа Люксембург у 1972 годзе выступала, так бы мовіць, двойчы замежніца, спявачка Вікі Леандрас — ураджэнка Грэцыі, але грамадзянка Германіі.

...Тым часам са сваімі ўдзельнікамі вызначыліся ўжо 26 краін з 42, якія пацвердзілі ўдзел у сёлетнім «Еўрабачанні». Найбольш высокая канкурэнцыя традыцыйна ў Швецыі, дзе на папярэдні адбор паступіла звыш 2700 песень, нулявая — у Расіі, дзе яшчэ з мінулага года было вядома, што краіну прадставіць прыкаваная да інваліднага крэсла спявачка Юлія Самойлава.

Міжнародны песенны конкурс «Еўрабачанне-2018», нагадаем, пройдзе з 8 па 12 мая ў сталіцы Партугаліі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■ Спорт-тайм

# Вечна малады і вечна першы

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра соты фінал у кар'еры Максіма Мірнага, поспехі беларускіх самбістаў на дамашнім турніры і выступленні нашых гандбольных клубаў у Еўропе.**

**1.** ***Максім Мірны паспяхова правёў свой соты фінал на турнірах пад эгідай Асацыяцыі тэнісістаў-прафесіяналаў.*** У Нью-Ёрку беларус і аўстрыец Філіп Освальд абыгралі ў вырашальным матчы парнага разраду яшчэ адзін інтэрнацыянальны тандэм Арцём Сітак (Новая Зеландыя) / Уэслі Колхаф (Нідэрланды) — 6:4, 4:6, 10:6.



Для 40-гадовага Максіма Мірнага цяперашні фінал быў соты ў прафесійнай кар'еры. Да гэтага ён правёў 95 вырашальных матчаў у парным разрадзе і 4 — у адзіночным. У парах у яго цяпер 51 чэмпіёнскі тытул, у адзіночным разрадзе — адзін.

**2.** ***Кацярына Галкіна заваявала тры ўзнагароды на этапе Гран-пры па мастацкай гімнастыцы ў Маскве.*** У фіналах асобных практыкаванняў беларуска перамагла ў кампазіцыі са стужкай, яна апярэдзіла расіянку Аляксандру Салдатаву і Баяну Калейн з Балгарыі. У практыкаванні з абручом Кацярына заваявала бронзавую ўзнагароду. У кампазіцыі з мячом гімнастка зноў паднялася на трэцюю прыступку п'едэстала.



У сакавіку нашы гімнасткі выступяць на традыцыйных спаборніцтвах у Рызе, прымуць удзел у Гран-пры ў Кіеве і этапе Кубка свету ў Сафіі.

**3.** ***Беларускія самбісты заваявалі 35 узнагарод на XXII Міжнародным турніры катэгорыі А — адкрытым чэмпіянаце Беларусі па самба на прызы Прэзідэнта.***

Пасля першага дня ў скарбонцы гаспадароў турніру было 19 (7 залатых, 4 сярэбраныя, 8 бронзавых) медалёў. У другі дзень спаборніцтваў беларускія атлеты яшчэ 16 разоў падымаліся на п'едэстал.

Акрамя нашых спартсменаў, уладальнікамі ўзнагарод сталі прадстаўнікі Арменіі, Балгарыі, Грузіі, Грэцыі, Ізраіля, Італіі, Латвіі, Малдовы, Манголіі, Расіі, Румыніі, Туркменістана і Украіны.

Сёлета на арэне мінскага Палаца спорту ў адкрытым чэмпіянаце Беларусі па самба выступалі амаль 300 атлетаў з 20 краін. Такое шырокае прадстаўніцтва абумоўлена пачаткам адбору на II Еўрапейскія гульні 2019 года ў Мінску.

**4.** ***Гандбалісты мінскага СКА ў другім туры розыгрышу групавой стадыі Кубка ЕГФ згулялі ўнічыю са славацкім «Татранам» з Прэшава — 25:25.*** У заключным паядынку першага круга спаборніцтваў 24 лютага армейцы згуляюць у Сількеборге супраць дацкага клуба «Б'ерынгбро». *Становішча камандаў пасля двух тураў:* «Магдэбург» — 4 ачкі, «Б'ерынгбро» — 2, СКА — 1, «Татран» — 1.

Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова ў чарговым матчы Лігі чэмпіёнаў пацярпеў паражэнне ў гасцях ад венгерскага «Веспрэма» — 22:34. Свой наступны паядынак яны правядуць у Брэсце супраць французскага клуба «Пары Сен-Жэрмен». Парыжане напярэдадні атрымалі сваю 11-ю вікторыю ў 12 матчах, разграміўшы ў сябе дома нямецкі «Фленсбург».

*Турнірнае становішча:* «Пары Сен-Жэрмен» — 22 ачкі, «Веспрэм» — 15, «Фленсбург» — 15, «Штутгарт» — 13, «Віве» — 11, БГК — 8, «Ольбарг» — 5, «Цэле» — 5.

У плэй-оф чэмпіёнскай лігі выйдуць 6 першых камандаў.

**5.** ***Спартсмены ХК «Мінск» заваявалі права выступіць у наступным сезоне ў эліце Кубка еўрапейскіх чэмпіёнаў па індар-хакеі.*** Мінчане паспяхова правялі дамашні турнір у другім па рангу дывізіёне, на паркеце сталічнага палаца спорту «Уручча» чэмпіёны Беларусі на папярэднім этапе занялі першае месца ў групе В, абыграўшы французскі «Ліль» — 10:3, шведскі «Парціль» — 5:3 і згуляўшы ўнічыю з харвацкім клубам «Зеліна» — 3:3.

Затым, у фінальным раўндзе, беларусы разграмілі дацкі «Слагелсе» з лікам 10:2 і за тур да фінішу спаборніцтваў забяспечылі сабе выхад у вышэйшы дывізіён.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.19 | 18.28 | 10.09 |
| Віцебск — | 8.11 | 18.15 | 10.04 |
| Магілёў — | 8.09 | 18.18 | 10.09 |
| Гомель — | 8.02 | 18.18 | 10.16 |
| Гродна — | 8.33 | 18.44 | 10.11 |
| Брэст — | 8.31 | 18.48 | 10.17 |

### Месяц

***Маладзік 16 лютага. Месяц у сузор'і Цяльца.***

### Імяніны

***Пр.*** *Аляксандра, Лукі, Парфена.*
***К.*** *Анеты, Людмілы, Леха, Лявона, Юльяна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

**20 ЛЮТАГА**




**1903** год — нарадзіўся (в. Хоціна, цяпер у Бешанковіцкім раёне) Леў Міхайлавіч Даватар, савецкі военачальнік, генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза (пасмяротна), герой абароны Масквы. Загінуў у 1941 годзе.

**1922** год — нарадзіўся (г. Бабруйск) Міхаіл Яўгенавіч Цікоцкі, беларускі мовазнавец, журналіст, доктар філалагічных навук, прафесар, заслужаны работнік культуры Беларусі. Аўтар даследаванняў па праблемах стылістыкі беларускай мовы і газетных жанраў, тэорыі і практыкі журналістыкі. Памёр у 2012 годзе.

**1947** год — нарадзіўся (в. Вялікае Стахава Барысаўскага раёна) Валерый Яўгенавіч Мазынскі, рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. З 1974 года — рэжысёр, у 1976—1989-м — галоўны рэжысёр Беларускага тэатра імя Я. Коласа, адзін з ініцыятараў стварэння пры тэатры беларускага тэатра «Лялька». Заснавальнік, у 1993—2000 гадах мастацкі кіраўнік Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. Паставіў спектаклі «Сымон-музыка», «Парог», «Вечар», «Радавыя» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі і прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.




**1886** год — нарадзіўся Бела Кун, вядомы дзеяч венгерскага і міжнароднага рабочага руху. У Савецкай Расіі змагаўся на франтах Грамадзянскай вайны супраць нямецкіх інтэрвентаў, чэхаславацкага корпуса, белагвардзейцаў Калчака. Актыўна пісаў артыкулы ў «Праўду» і «Известия». Асабіста прымаў удзел у расстрэлах класавых ворагаў у Сібіры. З 1921 года з'яўляўся членам Выканкама Камінтэрна і кіраўніком нелегальнай работы, старшынёй Венгерскай Камуністычнай партыі. З 1928 года пастаянна жыў у Савецкім Саюзе, з'яўляючыся актыўным дзеячам Камінтэрна. Падчас рэпрэсій у 1938 годзе Бела Кун быў арыштаваны па абвінавачванні ў контррэвалюцыйнай дзейнасці і расстраляны.



**1940** год — упершыню на экранах з'явіўся знакаміты мультсерыял пра ката Тома і мышаня Джэры. Мультфільм быў створаны мультыплікатарамі Уільямам Ханнай і Джозэфам Барберай. Гэты серыял ствараўся галівудскай студыяй MGM з 1940-га да закрыцця мультыплікацыйнай студыі ў 1958 годзе, быў прызнаны найлепшым і з'яўляецца ўладальнікам сямі ўзнагарод кінапрэміі «Оскар».

## УСМІХНЕМСЯ

**Вучыў учора з сынам урокі. Горш толькі з жонкай шпалеры клеіць.**

— І куды ты такі прыбраны?
— На спатканне.
— А чаму без кветак?
— А ў мяне трусы ў рамонак.

**Маніпуляваць дурнем лёгка, проста не забывай казаць яму: «Ну ты ж разумны чалавек...»**

— Добры дзень, мілы, я прыйшла!
— Праходзь, любая, адчувай сябе як дома! Вунь там восць прапыласось.

**Змагалася са смуткам. Зайшла ў сацыяльных сетках на старонку да незнаёмага мужчыны і напісала пад яго фота: «Ты мяне не кахаеш...» Сёння ў мяне на старонцы пабывала дзвесце яго сяброў на чале з жонкай.**

**Мужык! Калі ты яшчэ жывы — даруй мне!..**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай — 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 725.
Нумар падпісаны ў 19.30 19 лютага 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12